ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК і МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

26 кастрычніка 1931 г. № 250 (1519)

Па-бальшавіцку рэалізаваць пастанову ЦК КП(б)Б

На 20-е кастрычніка г-г па Беларусі плян загатовак збожжа выканан на 35,4 проц., ільнавалакна—1 проц., бульбы—20 проц. Гэтыя лічбы зусім ясна гавораць, што ход загатовак абсалютна нездавальняючы і выклікае трывогу.

Пастанова ЦК КП(б)Б дае зусім ясны і правільны аналіз прычын прарыву на фронце загатовак і намячае конкрэтны бальшавіцкі шлях пасьпяховага іх правядзеньня.

Асаб іва ганебнаю плямай вызначаецца ход загатовак у такіх раёнах: Тураўскі—выканаў квартальны плян на 10,7 проц., Асіпавіцкі—на 12,3 пр. Клічаўскі—13,5 проц. і рад іншых. Па пастанове ЦК, кіраўніцтва гэтых раёнаў зьнята, як няздольнае выконваць задачы партыі. Таксама за опортуністычны самацёк і абман партыі зьнята кіраўніцтва Белсаўгастрэсту.

Паданыя лічбы—лепшыя паказчыкі таго што ў гэтых раёнах комсамольская організацыя таксама опортуністычна бязьдзейнічае ў справе загатовак. Кіраўніцтва гэтых комсамольскіх організацый ня здолела мобілізаваць масы колгасьнікаў, беднякоў і серадн якоў аднаасобнікаў і моладзь на выкананьне плянаў загатовак.

Праводзячы політыку „няўмяшаньня“ і лічачы, што посьпехі колектывізацыі гарантуюць выкананьне загатовак, гэтыя комсам. ор-цыі не мобілізуюць комсамольскія і маладзёжныя масы на датэрміновае выкананьне і перавыкананьне заданьняў партыі, райкомы і ячэйкі комсамолу гэтых раёнаў самі апынуліся на правао портуністычных позыцыях. Чым, як ня поўным прытупленьнем клясавай дбайнасьці, можна вытлумачыць той факт, што толькі на пленуме Браніслаўскага с-савету (Жыткавіцкі раён), які знаходзіцца ў глыбокім тыле загатовак, высьветлілася, што з 3-х ячэек с.-савету ні адна ня прымала ўдзелу ў яго працы і нічога не рабіла ў справе загатовак. Той факт, што райкомы, комсамольскія ячэйкі вышэйадзначаных раёнаў і комсамольцы Белсаўгастрэсту не дагледзелі падобных бясчынстваў і своечасова не зьвярнулі ўвагу на політыку самацёку, якая вядзецца кіраўніцтвам гэтых раёнаў і ўстаноў паказвае, на якім нізкім узроўні знаходзіцца клясавае выхаваньне і клясавая пільнасьць гэтых райкомаў КСМ.

Гэтыя райкомы і ячэйкі не сыгналізавалі аб опортуністычнай стаўцы на самацёк, аб наяўнасьці дробных буржуазных уплываў у гэтых раёнах і ўстановах і такім чынам знаходзіліся ў палоне буржуазных тэндэнцый.

Усе райкомы і ячэйкі павінны ўзяць з гэтай практыкі вурок.

Малейшыя спробы зьнізіць рэальныя для выкананьня пляны, спробы здаволіць „перш свае патрэбы“ павінны сустрэць з боку комсамольскіх ячэек руйнуючы адпор. Патрэбна змагацца за першачарговае выкананьне саўгасам і колгасамі плянаў загатовак.

Комсамол абвясьціў паход за ахову ўраджаю. Давесьці да канца гэты паход—значыць ня толькі ўзьняць ураджай, а і выканаць пляны загатовак. Гэтыя-ж райкомы і ячэйкі да канца паход не давялі.

Комсамольскія ячэйкі павінны максымальна павысіць клясавую пільнасьць рашуча выступіць супроць праваопортуністычнай практыкі, супроць кулацкіх тэндэнцый адсталай масы колгасьнікаў.

На аснове соцспаборніцтва і ўдарніцтва ячэйкі павінны дабівацца сустрэчных плянаў і датэрміновага выкананьня загатовак колгасамі і аднасобнікамі.

У самы кароткі тэрмін цьвёрдыя заданьні па ўсіх відах загатовак павінны быць выкананы. Праводзіць гэтыя работы трэба з чуткім клясавым падыходам каб не дапусьціць перагібаў у адносінах серадняцкае часткі вёскі.

Неабходна праверыць нарыхтоўчы апарат з пункту погляду яго клясавай пільнасьці і баяздольнасьці кіраваць загатоўкамі, дабіваючыся ачысткі яго ад клясава чужых элемэнтаў, вылучаючы ў гэты апарат комсамольцаў-колгасьнікаў і беднату.

У раёнах тэхнічных культур, перад комсамольскай організацыяй стаіць асабліва важная задача. Тут уся работа павінна быць накіравана на своечасовую здачу сыравіны прамысловасьці. На абмалот і загатоўкі трэба кінуць лепшыя сілы організаваць ударныя брыгады на малацілках і ўдарныя транспортныя брыгады для адвозкі збожжа.

Выканаць пастанову ЦК КП(б)Б і задачы загатовак можна толькі пры правільнай расстаноўцы комсамольскіх сіл і мобілізацыі шырокіх мас колгасьнікаў і беднякоў, серадн якоў аднаасобнікаў. Уся гэта работа павінна быць увязана з далейшым організацыйна-гаспадарчым узмацненьнем колектывізацыі, рашучай барацьбою з кулацтвам і яго агентамі-опортуністымі розных масьцей.

У фашысцкай Польшчы

63 фабрыкі ў полымі забастоўкі

Кожны дзень прыносіць усё большыя цяжкасьці ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы. Фабрыкі і заводы масамі зачыняюцца, параджаючы шпаркі рост беспрацоўя.

Фашысцкія газэты падамляюць, што рабочыя лодзінскай шоўкавай прамысловасьці выставілі прадпрыемцам запатрабаваньне ўрэгуляваць тарыфныя стаўкі і плаціць зарплату за той час, калі фабрыка не працуе. Рабочыя патрабуюць палепшаньня ўмоў працы і прызнаньня рабочых дэлегацый.

Прадпрыемцы ня выканалі гэтых запатрабаваньняў і рабочыя пачалі баставаць. Забастоўкай ужо зараз ахоплены 63 фабрыкі. Забастовачны рух ахоплівае зараз усё болей і болей прадпрыемстваў.

Лодзінская фашысцкая прэса са страхам адзначае вялікі забастовачны і рэволюцыйны рух і настойлівасьць у барацьбе ўсіх рабочых.

Газэта піша: „калі фабрыканты ня згодны ажыцьцявіць патрабаваньні рабочых, дык трэба спадзявацца ў хуткі час выбуху ўсеагульнай забастоўкі ў тэкстыльнай прамысловасьці Лодзінскай акругі“.

Варшаўскі мэталюргічны забаставаў

ВАРШАВА. Раптам выбухла ўсеагульная забастоўка ў Варшаве на мэталюргічным заводзе „Бляха“ з прычыны дрэнных умоў працы і доўгага часу ня выплаты зарплаты. Настрой рабочых вельмі баявы. Забастоўка праходзіць пры вялікай згуртаванасьці і рэволюцыйным уздыме ўсіх рабочых.

Банкруцтвы польскіх прадпрыемстваў

ВАРШАВА. Па дадатковых зьвестках банкруцтва Верхня-Сілескае фабрыкі выбуховых матэрый „Остаг“ пацягнула за сабою таксама ліквідацыю хэмічнага заводу „Азот“ які належыць гэтаму концэрну, і фабрыкі кнотаў і выбуховых матэрый у Яворне (Галіцыя).

Пад уціскам пілсудчыны

Выступіўшы ў соймавай камісіі міністр земляробства Польшчы заявіў, што падаткі і проценты па даўгох складаюць 40 проц. агульнага прыбытку сельскай гаспадаркі.

Аб становішчы сялян гавораць наступныя офіцыйныя даныя у той час, як перад вайною селянін за плуг плаціў 135 кгр. жыта—цяпер ён плаціць 321 кгр., за 10 кгр. цукру плаціў 46 кгр. а жыта цяпер 117 кгр., цук—6 кгр. жыта, цяпер—26 кгр. за адну пару ботаў —75 кгр., цяпер—321 кгр.

Суровы прысуд над 8 комсамольцамі

ВЕНА. Па паведамленьню з Будапэшту, за апошнія 2 месяцы там адбыўся рад процэсаў супроць рэволюцыйных рабочых.

У ліку іншых процэсаў слухалася справа 8 комсамольцаў, абвінавачваных у выданьні і распаўсюджваньні лістовак. Галоўны абвінавачваны Роспам прысуджаны да 3 год, астатнія—да розных тэрмінаў турэмнага зьняволеньня.

Вялікія хваляваньні на высьпе Кіпр

ЛЁНДАН. У Нікозіі—галоўным горадзе высьпы Кіпр адбыліся вялікія хваляваньні. Натоўпы дэманстрантаў зьбіраліся каля дому ўраду, дзе адбылася сутычка з паліцыяй. Дэманстранты пусьцілі ў ход каменьне і палкі і падпалілі памяшканьне ўраду. Памяшканьне згарэла да шчэнту. Паліцыя спачатку не ўдавалася разагнаць натоўп, і толькі тады, калі яна адкрыла агонь, дэманстрацыя была разгнана. Паранена 11 чалавек, забіты адзін. Хваляваньні адбыліся на глебе нацыянальна вызвале чага руху, які працякае на Кіпры пад лёзунгам адлучэньня ад Англіі і аб'яднаньня з Грэцыяй. Ангельскі вярхоўны камісар зьвярнуўся да ўраду высьпы Мальта з просьбай прыслаць ваенныя морскія судны ў падмацаваньне ангельскага гарнізону высьпы Кіпр.

Усходні раён Мукдэнскай провінцыі, а так сама Ушунскі і Таньянскі паветы аб'явілі сябе незалежнымі. Узьнік яшчэ адзін „незалежніцкі рух“, узначалены генэралам Лін-Інчынам. Не падлягае сумленьню, што „незалежніцкі рух“ карыстаецца як моральным, так і матар'яльным падтрыманьнем з боку Японіі. (З газэт).

Сутычкі, перастрэлкі...

БЭРЛІН. Учора ў Гасоне (сярэдняя Нямеччына) нацыянал-соцыялістыя (фашыстыя) справакавалі цяжкія сутычкі з рабочымі.

Учора ўвечары ў Франкфурце-на-Майне адбылася перастрэлка паміж паліцыяй і рабочымі. Некалькі паліцэйскіх паранена.

Забастоўка 10 тысяч беспрацоўных

БЭРЛІН, 24. 10 тысяч беспрацоўных, зан тых на прымусовых работах, аб'явілі забастоўку, патрабуючы адмены прымусовай працы для беспрацоўных і аплаты працы занятых на грамадзкіх работах па тарыфу. Беспрацоўным прыходзіцца працаваць ад 9 да 12 гадзін у тыдзень, каб мець права на дапамогу ў суме ад 8 да 9 марак (каля 4 руб.).

Грандыёзны мітынг працоўных жанчын

БЭРЛІН. У гар-палясе адбыўся шматлюдны мітынг працоўных жанчын Бэрліна з дакладам выступіў член ЦК нямецкай компартыі тав. Рэммэле. Сваю прамову тав. Рэммэле пачаў з паказаньня на тую вялізарную ролю, якую працоўныя жанчыны адыгралі ў гісторыі рэволюцыйнага руху пролетарыяту, асабліва ў рэволюцыйнай барацьбе супроць імпэрыялістычнай вайны.

Мы заяўляем імпэрыялістым—выгукнуў тав. Рэммэле,—што калі яны пасьмеюць напасьці на Савецкі Саюз, дык гэта сапраўды будзе апошняй вайной. Набліжаецца чырвоны сусьветны Кастрычнік, сьмела і з натхненьнем ідзем да яго,—закончыў сваю прамову тав. Рэммэле пад бурную авацыю прысутных.

Пасьля Рэммэле ўзяла слова, перашоўшая ў компартыю быўшая вядомая соцыял-дэмократычная актывістка Торгост, якая рэзка выкрыла соцыял-дэмократыю, асабліва новую цэнтральную партыю Зэйдэвіца. Далей выступіў прадстаўнік рабочых Брауншвэйгу, расказаўшы аб барацьбе браўншвэйскіх рабочых супроць фашысцкага тэрору.

Вялізарнае ўзбурэньне выклікала паведамленьне кіраўніка сходу аб тым, што перашоўшы ў компартыю былы лейтэнант рэйхсвэру Шэрынгер, які адбывае зяключэньне ў крэпасьці, пераведзен у так званую „сталёвую камэру“.

Пасьля прыняцьця адозвы да ўсіх працоўных жанчын, мітынг закрыўся пяяньнем „Інтэрнацыяналу“. На зьезьдзе ўступілі ў компартыю 15 работніц і завербавана 170 новых падпісчыкаў на комуністычны друк.

Чарговае банкруцтва

ГЕЛЬСЫНГФОРС 23.—Учора офіцыйна аб'яўлена банкруцтва Паўднёва-Остработніцкага банку, які быў заснаваны і ўзначальваўся лідэрамі лапуаскага дзяленьня.

У найкарацейшы тэрмін выканаць дырэктыву партыі

Падзесяцярыць тэмпы загатоўкі і адгрузкі эшалёнаў

ЦК КП(б)Б адзначыў, што загатоўка і адгрузка бульбы за межы БССР праходзіць надзвычай павольнымі тэмпамі. Сучасныя тэмпы не забясьпечваюць выкананьня пляну адгрузкі да 1 лістапада 175 тысяч тон Ленінграду і іншым прамысловым цэнтрам. На 21 кастрычніка плян выканан на 56,9 проц.

Комсамольскія організацыі павінны пановаму ўзьняць тэмпы работы, каб выканаць пастанову сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ аб адгрузцы комсамольскіх эшалёнаў.

К 1 лістапада плян загатоўкі 175 тысяч тон павінен быць выканан. Мацней агонь па опортуністычнай стаўцы на самацёк.

У падарунак пленуму ЦК

Менск ЦК ЛКСМБ „Чырвонай Зьмене“

ГОМЕЛЬ. 24 Гомельская комсамольская організацыя, у падарунак пленуму ЦК партыі, адгрузіла 100 тон бульбы для пролетарыяту Ленінграду. Працягваем работу па выкапцы, загатоўцы і адгрузцы.

Райкамол Камісарчык.

Мобілізавана 100 чал. актыву

Парычы. Мобілізавана 100 чал. партыйнага і комсамольскага актыву на выкапку, загатоўку і адгрузку бульбы Ленінграду. 21-га сіламі комсамольцаў на Парыцкай прыстані адгружана баржа з 6 ваганаў.

Нори.

Рыхтуем адпраўку другога

Менск, „Чырвонай Зьмене“

ГОРКІ. Комсамольская організацыя, дзякуючы ўдарнай рабоце, 24-га адправіла рабочым Ленінграду комсамольскі эшалён з 34 вагонаў бульбы і 6 вагонаў гародніны. Эшалён абслугоўваюць комсамольскія сілы. На 28 кастрычніка рыхтуем адпраўку другога комсамольскага эшалёну.

Горацкі райкамол.

Штурмуем

Менск „Чырвонай Зьмене“

З 20-га кастрычніка па 1-е лістапада Чашніцкі райком ЛКСМБ абвясьціў штурм прарываў у выкапцы, загатоўцы і адгрузцы бульбы. На ліквідацыю прарыву мобілізаваны ўсе комсамольцы.

Па колгасах, загатоўчых пунктах і на станцыях організаваны пасты сяраднога комсамольскага кантролю.

У дапамогу загатоўчым організацыям накіравана 25 чал. з раённага комсамольскага актыву. У адстаючыя сельсаветы накіравана 5 комсамольскіх брыгад.

З 22 кастрычніка пачалася масавая адгрузка комсамольскіх эшалёнаў бульбы.

Зайцаў.

Плян перавыканан

Менск, ЦК ЛКСМБ „Чырвонай Зьмене“

КЛІМАВІЧЫ. Плян адгрузкі бульбы Ленінграду перавыканан, за што раён прэміяваны. Комсамольская організацыя накіравала 400 чал у колгасы для сканчэньня копкі бульбы.

Райком Кацман.

Адгружана 49 вагонаў

ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене“

Буда-Кашалеўскі раён. Сіламі комсамольскай організацыі загатоўлена і адгружана 49 вагонаў бульбы для пролетарыяў Ленінграду.

10 брыгад—на загатоўкі

БРАГІН. Комсамольская організацыя Брагінскага р-ну абвясьціла дэкаднік штурму прарыва ў выкапцы, загатоўцы і адгрузцы бульбы. Кожная комсамольская ячэйка атрымала конкрэтнае заданьне. Больш 10 брыгад накіравана ў адстаючыя сельсаветы і колгасы. Брыгадам пастаўлена задача: у найкарацейшы тэрмін забясьпечыць выкананьне колгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі плянаў бульбы і хлебазагатовак.

С.

Вышэй клясавую пільнасьць

Мацней удар па права-опортуністычнай практыцы, „левых“ загібах у загатоўках, кулацкіх, спажывецкіх і рвацкіх тэндэнцыях

„Разгарнуць самую актыўную работу вакол выкананьня плянаў загатовак, зараз-жа ўжыць меры для выпраўленьня дапушчаных скажэньняў, спыніць усялякія гутаркі аб нерэальнасьці плянаў і ўзяцца за іх сапраўды бальшавіцкае выкананьне“ (З пастановы ЦК КП(б)Б)

ПАСТАНОВА ЦК—СУРОВАЕ ПАПЯРЭДЖАНЬНЕ ДЛЯ ЎСІХ ПАРТЫЙНЫХ І КОМСАМОЛЬСКІХ ОРГАНІЗАЦЫЙ

Аб ходзе загатовак збожжа, бульбы, лёну, жывёлы і адгрузкі бульбы для пролетарскіх цэнтраў СССР

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б адзначае, што выкананьне гадовых плянаў загатовак (па стане на 20 кастрычніка 1931 году) збожжа—35,4 проц., ільнавалакна—1 проц., ільнасемя—27,2 проц., бульбы—20 проц. і жывёлазагатоўках—7,7 проц. квартальнага пляну—зьяўляецца абсолютна нездавальняючым і тармозячым ход выкананьня асноўных гаспадарча-палітычных задач, што стаяць перад КП(б)Б.

Асабліва недапушчальным трэба лічыць яўнае адставаньне соцыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі: гэта выяўляецца ў тым, што адносная вага колгасаў у загатоўленым збожжы (на 16 кастрычніка) складае толькі 28,7 проц. і саўгасаў—0,5 проц.

ЦК лічыць, што такое нездавальняючае становішча з загатоўкамі, пры поўнай рэальнасьці і магчымасьці выканаць намечаныя пляны ў скарочаныя тэрміны, можна тлумачыць наступнымі асноўнымі прычынамі.

1 Дырэктывы ЦК аб разгортваньні загатовак і ў прыватнасьці пастанова ЦК аб збожжазагатоўках (29 верасьня г. г.), якая абавязвала саўгасныя трэсты, Белколгасцэнтр, Трактарацэнтр, збожжазагатоўчыя організацыі і райпарторганізацыі па-бальшавіцку разгарнуць работу за выкананьне плянаў загатовак; дырэктыва, у якой ЦК патрабаваў рашучай барацьбы з кулацкай практыкай складаньня збожжафуражных балянсаў і барацьбы з разважаньнямі аб нерэальнасьці плянаў загатовак—фактычна ня выканана.

2 Замест бальшавіцкай барацьбы за выкананьне плянаў загатовак, энэргія раду кіраўнікоў партыйных і савецкіх організацый была накіравана не на выкананьне плянаў загатовак, а на разважаньні аб нерэальнасьці і немагчымасьці іх выканаць і на абарону неабходнасьці ўстанаўленьня перапамяншаных плянаў, што прывяло да фактычнай барацьбы супроць плянаў.

Сярод раду работнікаў і нават у тым ліку кіраўнікоў раённых парторганізацый існуюць антыпартыйныя настроі і стаўка на самацёк у загатоўках, якія (настроі) па сутнасьці адбіваюць кулацкую лінію і зьяўляюцца вынікам неразуменьня новых форм клясавай барацьбы і тактыкі кулака, які імкнецца шляхам уплыву на найбольш адсталыя пласты колгасьнікаў распальваць спажывецкія настроі і тым самым разбураць колгасы з сярэдзіны. Гэтыя спажывецкія і рвацкія настроі ў радзе колгасаў, якія ствараюцца клясавым ворагам ня толькі не сустракалі рашучага і руйнуючага адпору, але падтрымліваліся паасобнымі кіраўнікамі колгасаў і організацый. Гэтыя кіраўнікі па сутнасьці зьявіліся агентамі кулака ў партыйным, савецкім і колгасным апараце.

3 Рад раённых організацый і кіруючых колгасных органаў (уключаючы і Белколгасцэнтр) устанавілі цьвёрдыя нормы збожжа і бульбы для кармоў, ня лічачыся з выкананьнем плянаў загатовак.

У радзе колгасаў ствараліся збожжафуражныя балянсы, у якіх сьвядома перапавялічваліся патрэбы колгасаў, існавала і існуе стаўка на браніяваньне кармоў і харчоў у першую чаргу для колгасаў, а потым толькі здачы (продажу) рэштак дзяржаве, складаліся сьвядома няправільныя акты ўраджайнасьці з мэтай меншай здачы лішкаў дзяржаве.

4 Белколгасцэнтр сваімі кіруючымі ўказаньнямі на броніяваньне у першую чаргу збожжафуражных фондаў (бяз уліку выкананьня пляну загатовак) і ў практычным кіраўніцтве колгаснай сыстэмай не забясьпечыў правільнага правядзеньня партыйнай лініі ў галіне загатовак і фактычна садзейнічаў распальваньню спажывецкіх настрояў у колгасах.

5 Белсельтрэст ня толькі ня выканаў выразна пастаўленых перад ім пастановай ЦК ад 29 верасьня г. г., задач, але сваімі яўна безадказнымі праваопортуністычнымі антыпартыйнымі адносінамі да загатовак і недапушчальна позьняй рассылкай плянаў загатовак (3 кастрычніка) фактычна сарваў загатоўкі саўгаснай сыстэмай ва ўстаноўленыя тэрміны. Гэта тым больш паглыбляецца опортуністычнымі адносінамі раду дырэктароў саўгасаў да выкананьня плянаў загатовак.

6 Парткіраўніцтва Клічаўскага, Тураўскага, Любаньскага, Петрыкаўскага, Чавускага, Чашніцкага, Асіпавіцкага, Жыткавіцкага, Бягомльскага, Чэрвеньскага, Койданаўскага, Дрысенскага, Мазырскага, Плешчаніцкага, Рэчыцкага, Полацкага, Барысаўскага, Вушацкага, Брагінскага, Глускага, Лельчыцкага, Пухавіцкага, Заслаўскага, Чачэрскага, Ельскага, Лепельскага і Чэрыкаўскага раёнаў не організавала бальшавіцкай барацьбы за загатоўкі збожжа, бульбы, лёну, мяса і інш. і не дало рашучага адпору спажывецкім і рвацкім настроям і гутаркам аб нерэальнасьці плянаў.

7 У радзе раёнаў існуе неразуменьне тэй новай абстаноўкі загатовак гэтага году, якая стварылася ў выніку нашых посьпехаў у колектывізацыі сельскай гаспадаркі (50 проц.). Існуе недапушчальная недаацэнка новых форм і неабходнасьці шырокага разгортваньня масавай работы вакол загатовак, побач з пашыранай практыкай адміністраваньня ў загатоўках.

ЦК пастанаўляе:

1 Прапанаваць раённым парторганізацыям, саўгасным трэстам, Белколгасцэнтру, Трактарацэнтру і загатоўчым організацыям разгарнуць самую актыўную работу вакол выкананьня плянаў загатовак, зараз-жа прыняць меры да выпраўленьня дапушчаных скажэньняў у загатоўках, спыніць усякія гутаркі аб нерэальнасьці плянаў і ўзяцца за іх сапраўды бальшавіцкае выкананьне.

Неабходна даць самы рашучы і бязьлітасны адпор рвацкім і спажы-

Колгасьнікі здаюць хлеб на ссыпным пункце.

вецкім настроям у радзе колгасаў, якія (настроі) зьяўляюцца вынікам кулацкага ўплыву і стаўкай клясавага ворага на зрыў загатовак і організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў.

2 Указаць раённым парторганізацыям, Белколгасцэнтру і саўгастрэстам на тое, што для ўмацаваньня на новай базе і разгортваньня жывёлагадоўлі колгасаў павінны быць мобілізаваны ў першую чаргу ўсе ўнутраныя рэсурсы колгасаў і саўгасаў і броніяваньне кармовых фондаў можа ўтварацца толькі пасьля выкананьня і ні ў якім разе не за лік скарачэньня.

3 Абавязаць упраўленьне Трактарацэнтру тав. Каршакевіча і старшыню Колгасцэнтру тав. Міцькова забясьпечыць масавую праверку колгасаў, згодна дырэктыў Трактарацэнтру і Колгасцэнтру СССР, з тым, каб выкрыць усе скажэньні ў галіне загатовак і дабіцца ў максімальна скарочаныя тэрміны выкананьня колгасамі плянаў загатовак.

4 За праваопортуністычнае кіраўніцтва загатоўкамі і дапушчэньне кулацкага распараджэньня райколгассаюзу не здаваць бульбы на загатоўкі да складаньня кармавога балянсу—зьняць з работы з абвяшчэньнем суровай вымовы сакратара Чавускага РК КП(б)Б т. Ільляшка і старшыню РВК т. Сокалава.

5 За праваопортуністычнае кіраўніцтва бальшавіцкай работай па выкананьню плянаў загатовак—зьняць з работы сэкратара Клічаўскага РК КП(б)Б т. [illegible]на, Турускага РК—т. Ляхава і Асіпавіцкага РК—т. Цішневіча.

Абвясьціць суровую вымову сакратарам РК КП(б)Б: Любаньскага—тав. Лагуценку, Петрыкаўскага—т. Навіцкаму, Бягомльскага—т. Клютко, Жыткавіцкага—т. Багданаву і Чашніцкага—тав. Тур (у прыватнасьці за позьняе спазьненьне ў загатоўках па лёну і жывёлазагатоўках).

Папярэдзіць райкомы КП(б)Б і ўпаўнаважаных ЦК—Койданаўскага, Чэрвеньскага, Дрысенскага, Мазырскага, Плешчаніцкага, Рэчыцкага, Полацкага, Барысаўскага, Вушацкага, Брагінскага, Глускага, Лельчыцкага, Пухавіцкага, Заслаўскага, Чачэрскага, Ельскага, Лепельскага і Чэрыкаўскага раёнаў, што калі на працягу бліжэйшай дэкады не будзе ў гэтых раёнаў дасягнуты рашучы пералом у загатоўках, ЦК у адносінах да кіраўніцтва гэтых раёнаў прыме самыя рашучыя меры.

Зьняць з работы дырэктара Вушацкай МТС тав. Баранава за праваопортуністычнае кіраўніцтва загатоўкамі, невыкананьне плянаў і адсутнасьць рашучай барацьбы са спажывецкімі настроямі ў колгасах і папярэдзіць дырэктараў іншых МТС, што ў выпадку неатрыманьня рашучага пералому ў загатоўках дырэктары МТС будуць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

6 Прапанаваць Колгасцэнтру, Наркомзему, Саўгасцэнтру і Трактарацэнтру скасаваць усе распараджэньні і дырэктывы па загатоўках, у якіх прадугледжана стварэньне ў колгасах і саўгасах збожжавых фондаў да іх поўнага выкананьня пляну загатовак.

Прыняць да ведама заяву старшыні Белколгасцэнтру тав. Міцькова аб выпраўленьні няправільных дырэктыў па загатоўках і аб тым, што Белколгасцэнтрам за зрыў плянаў загатовак і опортуністычныя адносіны да гэтай справы распушчана праўленьне Асіпавіцкага райколгассаюзу, зьняты з працы старшыня Карм янскага райколгассаюзу тав. Каршуноў, Клічаўскага—тав. Бэрг і Чачэрскага—тав. Каган і абвешчаны вымовы старшыням Лагойскага райколгассаюзу—тав. Вераб'ёву, Гарадоцкага—тав. Мельнікаву і Чашніцкага—тав. Юшкоўскаму.

Справы аб зьнятых старшынях райколгассаюзаў перадаць на разгляд ЦКК.

7 ЦК адзначае, што Белсельтрэст на працягу двух месяцаў не давёў плянаў збожжазагатовак да саўгасаў сваёй сыстэмы. Тав. Грэбенчык—дырэктар Белсельтрэсту—ня выканаў пастановы ЦК ад 29 верасьня і сваімі антыпартыйнымі адносінамі да загатовак сыграў на руку клясаваму ворагу. Зьняць т. Грэбенчыка з работы дырэктара „Бельсельтрэсту“ з абвяшчэньнем суровай вымовы.

8 ЦК адзначае, што бульбазагатоўкі ідуць надзвычай павольным тэмпам і таму не пакрываюць патрэбы вывазу. Прапанаваць парторганізацыям і загатоўчаму апарату форсаваць бульбазагатоўкі, улічваючы неабходнасьць поўнага забясьпечаньня вывазу.

Перакінуць усе раёны на вываз бульбы для Ленінграду, спыніўшы ўсякія перавозкі бульбы па чыгунцы для мясцовых патрэб з тым, каб поўнасьцю выканаць плян вывазу не пазьней як да 1 лістапада г. г.

9 Адзначыць зусім недапушчальную расхлябанасьць у пастаноўцы ўліку загатовак, у прыватнасьці існаваньне ўвязкі на ўліку здаванага збожжа і здаванай прадукцыі па асобных сэктарах: колгасах, індывідуальным сэктарам сельскай гаспадаркі,—прапанаваць Белколгассаюзу, пад адказнасьць тав. Хасіна, Наркомснабу, пад адказнасьць т. Балціна, Белхлебжывёлсаюзу, пад адказнасьць тав. Журомскага, Белільнасаюзу, пад адказнасьць тав. Вішнеўскага, і Белсадсаюзу, пад адказнасьць тав. Панамарова ўстанавіць дасканалы ўлік загатовак, у прыватнасьці ўлік здаванай продукцыі ў сэктарыяльным разрэзе, асабліва па сыстэме Белкоопсаюзу.

10 Прапанаваць усім РК неадкладна разгарнуць рашучую барацьбу супроць недаацэнкі аднаасобнага сэктару ў выкананьні плянаў загатовак супроць падмены масавай работы адміністраваньнем, за разгортваньне шырокай масавай работы і сапраўдную організацыю колгасьнікаў, беднаты і серадзякоў-аднаасобнікаў на бальшавіцкую барацьбу за выкананьне загатовак гэтага году ў скарочаныя тэрміны, раўняючыся на лепшыя раёны (Крычаў, Гомель, Сураж, Нароўля, Горкі).

11 Прапанаваць Белколгасцэнтру і агітмасаваму аддзелу ЦК сумесна з рэдакцыямі газэт „Зьвязды“ і „Колгасьнік Беларусі“ організаваць перадавыя ў загатоўках колгасы, прэміяваць ужо зараз перадавыя раёны і колгасы, якія выканалі і набліжаюцца да выкананьня пляну загатовак, скліваць іх зьлеты, узяўшы на буксір адстаючыя колгасы і раёны, разгарнуўшы шырокую масавую работу па мобілізацыі адстаючых на выкананьне плянаў, рашуча змагаючыся з практыкай адміністраваньня ў загатоўках.

12 Пацьвердзіць неаднакротныя дырэктывы ЦК аб спагнаньні загатовак з кулацка-заможных гаспадарак па цьвёрдых заданьнях. Прапанаваць усім РК КП(б)Б неадкладна выканаць тэлеграфную дырэктыву ЦК па гэтаму пытаньню ад 21 кастрычніка г. г.

Комсамол павінен быць уперадзе

Хлебазагатоўкі у Крупскім раёне праводзяцца самацёкам. На 10-е кастрычніка гадовы плян выкананы на 21 проц. Апошняя дзесяцідзёнка не дала амаль ніякага зруху у загатоўках. 20 кастрычніка процант выкананьня узьняўся толькі да 25,5.

Комсамольскія ячэйкі шмат якіх колгасаў раёну злачынна бязьдзейнічаюць, яўна недаацэньваючы ўсёй важнасьці хлебазагатоўчай кампаніі Твару комсамолу ў выкананьні важнейшай гаспадарча-палітычнай кампавіі ня відаць. Комсамол Крупскага раёну не набіраваў сваіх сіл на ўзмацненьне адказнейшага гаспадарча-палітычнага фронту.

Ніякай масава-палітычнай работы сярод мас колгасьнікаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па організацыі чырвоных абозаў хлеба не праводзіцца.

Опортуністычнай недаацэнцы хлебазаготовак і злачыннай, недапушчальнай бязьдзейнасьці павінен быць пакладзен канец.

Комсамол ня можа быць у баку ад гаспадарча-палітычнага фронту. На фронце упартай барацьбы за хлеб ён павінен быць перадавіком.

Алексяёнак Яика.

Разьбіць опортуністычную бязьдзейнасьць

Хлебазагатоўкі па Менскім раёне праходзяць марудна. Дырэктывы партыі і ўраду выканаць гадовы плян хлеб загатовак да 1-га лістапада на 65 проц.—ня выконваюцца. На 20-е кастрычніка гадовы плян хлебазагатовак выкананы толькі на 30,8 проц. кулацка-заможныя гаспадаркі выканалі цьвёрдае заданьне ўсяго на 27 проц., што сьведчыць аб паўнейшай бязьдзейнасьці некаторых партыйных і комсамольскіх організацый.

Масава-растлумачальная работа вакол хлебазагатовак не разгорнута Райколгассаюз, які зьяўляецца галоўным загатавальнікам у раёне не перабудаваў свае работы. Загатоўцы толькі прымаюць збожжа, а праводзіць масавую работу ня лічаць патрэбным.

Некаторыя комсамольскія ячэйкі опортуністычна адносяцца да выкананьня пляну хлебазагатовак, ігнорують выкананьне пастаноў партыі і ўраду, што ні ў якім разе ня можа быць цярпіма.

Партыйныя і комсамольскія ячэйкі, колгасьнікі і вясковы актыў павінны ўзмацніць закінуты вучастак сваёй работы і па-бальшавіцку ўзяцца за ліквідацыю прарыву ў хлеба загатоўках.

Трэба моцна і рашуча ўдарыць па опортуністычнай недаацэнцы хлебазагатоўчай кампаніі, узьняць тэмпы загатовак, прымусіць кулака выканаць цьвёрдае заданьне і забясьпечыць датэрміновае выкананьне пляну хлебазагатовак.

ГРЫЗУН

Жыткавіцкі комсамол дрэнна выконвае дырэктывы партыі

Жыткавічы. 24. (Па тэлефону ад нашага спэцкора).

Ня гледзячы на ўсю рэальнасьць плянаў загатовак, жыткавіцкія партыйныя і комсамольскія організацыі не па бальшавіцку змагаюцца за іх выкананьне. Плян збожжазагатовак у Жыткавіцкім раёне на 21-е кастрычніка выкананы на 31,5 проц. Да 25 кастрычніка раён павінен быў адгрузіць для рабочых Ленінграду 832 тоны бульбы, на 15 кастрычніка адгружана ўсяго 447 тон. Агульны плян загатоўкі бульбы па раёне на 20 кастрычніка выкананы на 13,1 проц. Ня лепш справа з выкананьнем плянаў і іншых відаў нарыхтовак.

Комсамольская організацыя раёну павінна была загатовіць гораду Леніна 11 кастрычніка 15 вагонаў бульбы: загатоўлена 11 вагонаў, а адпраўлена толькі 4. Комсамольскія ячэйкі Юркавіцкага і Жыткавіцкага сельсавету ганебна праваліліі загатоўку бульбы. Комсамолія, організаваўшы 11 кастрычніка чырвоны абоз бульбы у апошні час злачынна зьнізіла тэмпы загатовак, не выканаўшы плянавых заданьняў.

Цэлы рад комсамольскіх ячэек раёну опортуністычна недаацэньваюць задачы выкананьня плянаў загатовак у паказаныя ўрадам тэрміны, не мобілізаваліся самі, не прыцягнулі беспартыйную працоўную моладзь і масы колгасьнікаў на вырашэньне гаспадарча-палітычных задач.

Аб тым, як некаторыя комсамольскія ячэйкі „змагаюцца“ за выкананьне плянаў загатовак, сьведчаць такія надзвычайна абураючыя факты.

15-га кастрычніка адбываўся пашыраны пленум Браніслаўскага сельсавету. На пленуме абгаварваў ся цэлы рад пытаньняў і мерапрыемстваў, каб вывесьці сельсавет з паласы глыбокіх прарываў у якой ён апынуўся з-за опортуністычнай практыкі кіраўніцтва сельсавету.

Існуючыя у гэтым сельсавеце 3 комсамольскія ячэйкі да гэтага пленуму, які абгаварваў стан усіх відаў загатовак прышлі ні з чым. Сельсавет ў паласе глыбокіх прарываў, а Браніслаўская, Вільчанская комсамольскія ячэйкі зусім бязьдзейнічаюць у выкананьні збожжа і іншых відаў загатовак.

Чарэцінская ячэйка якая другі год існуе пры колгасе, зусім не абгаварвала пытаньня загатовак, не ведае ці выканаў колгас плян ці не.

Комсамольскія ячэйкі іншых сельсаветаў таксама у большасьці выпадкаў праходзяць міма задач збожжа і бульбазагатовак.

Ячэйкі не популярызавалі лёзунг „ніводнага кілё хлеба прыватніку“

У надзвычайна абураючым стане і іншыя віды загатовак. Плян загатоўкі жывёлы па раёне выкананы толькі на 4,7 проц. (на 15 кастрычніка) Комсамольскія ячэйкі ў большасьці пакладаліся на самацёк

За няздольнасьць мобілізаваць усю комсамолію на баявое выкананьне пляну загатовак і надаць ім бальшавіцкія тэмпы. Жыткавіцкі РК ЛКСМБ павінен быць прыцягнуты да адказнасьці. **К.**

БАРАЦЬБА З БЕЗДАРОЖЖАМ

БАРАЦЬБА ЗА ХЛЕБ, ЗА ЛЕС, ЗА МЯСА, ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЮ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Ніводнага мэтру непраезжай дарогі!

Пасьпяховае выкананьне гаспадарча-палітычных задач у значнай меры залежыць ад транспарту і мясцовых дарог

Комсамольскія організацыі павінны не паслабляць барацьбы за добрыя дарогі, за вызначаныя пляны па рамонту і будаўніцтву дарог

Гэтага, як ніколі, патрабуе разьвіцьцё і соцыялістычная рэконструкцыя нашай гаспадаркі

У штурм бездарожжа ня ўключыліся

Дырэктыва ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ аб месячніку штурму бездарожжа у Рагачоўскім раёне ня выконваецца. Праўда пры РВК створаны штаб па барацьбе з бездарожжам, але ніякай работы ён не праводзіць.

Іншыя організацыі раёну, у тым ліку і комсамол, у барацьбе з бездарожжам абмежаваліся толькі агульнымі пастановамі Рад комсамольскіх ячэек дарожнай справай зусім не займаліся.

На 15 кастрычніка па раёне адрамантавана толькі 30 клм. дарогі, замест вызначаных па пляну 70 клм. Насыпана каля 2 клм. дарогі. Увогуле дарплян выкананы на 15 %

Плян рамонту і будаўніцтва мастоў выканан на 65 проц.

Будаўніцтва не забасьпечана ў патрэбнай колькасьці дошкамі, цьвікамі, жалезам і інш. матэр'яламі.

З прычыны опортуністычнай недаацэнкі дарожнага будаўніцтва, грамадзкасьць не організавана на ліквідацыю бездарожжа. Усебеларускі комсамольскі суботнік па барацьбе з бездарожжам праходзіць бяз удзелу працоўных Рагачоўшчыны.

Партыйныя і комсамольскія ячэйкі павінны зараз-жа ўключыцца у суботнік і ліквідаваць прарыў у выкананьні дарпляну.

Пост „ЧЗ“ Рабаў.



Аўто у бездарожжы

У выкананьні плянаў адстаюць

По весткам з Галоўдартрансу, на 15 кастрычніка г. г., у выкананьні пляну рамонту і будаўніцтва дарог раённага і сельскага значэньня патрэбнага зруху ня было.

Адстаюць раёны: Касьцюковіцкі, Горацкі, Дубровенскі, Магілеўскі, Жлобінскі і Слуцкі.

Такі стан работ ня можа забясьпечыць пасьпяховы ход хлебанарыхтовак.

Партыяй і ўрадам дадзена дырэктыва: датэрмінова здаць лішкі хлеба. Дрэнныя дарогі зрываюць і падаражаюць перавозкі збожжа.

Партыйныя і комсамольскія організацыі раёнаў павінны дабіцца пераломy ў бок хутчэйшай ліквідацыі бездарожжа. У дні комсамольскага суботніку ячэйкі комсамолу павінны быць мобілізаванымі на ліквідацыю бездарожжа.

Да сьвята Кастрычнікавай рэволюцыі комсамольскія організацыі адстаючых раёнаў павінны прыйсьці з дадатнымі вынікамі ў галіне выкананьня плянаў дарожнага будаўніцтва.

П. Бу—ін.

Калі дні ідуць па-старому...

Комсамол Любаньшчыны адказны за дарбудаўніцтва

Не выпадкова ў Любаньскім раёне ў рамонце дарог атрымаўся прарыў.

Дні ішлі, як і заўсёды.

Справа рамонту і будаўніцтва дарог патрабавала організацыі мас, выкананьне плянаў патрабавала рабсілы.

Дзесяткі організатары дарожнага будаўніцтва Любаньшчыны хадзілі спусьціўшы рукавы, драмалі дзень і ноч, а дні.., праходзілі сваёй чарадою. Падвозка лесаматэр'яла, каменьня і інш. была адкінута на задні плян. Ніводная організацыя не падумала аб тым, як і дзе атрымаць рабочую сілу. Старыя масты даламлівал ся, аб новых і перспэктыў ня было.

Насунулася глыбокая восень. Дадждыператварылі нерамантаваныя дарогі ў глыбокія бяздоньні.

—Ехаць нельга,—гаварылі калгасьнікі, вязучы збожжа ў Любань.

—На мастох коні ламаюць ногі, а наша начальства і ў вус ня дзьме,—скардзіўся кожны, хто праяджаў праз разбураныя масты Любаньшчыны.

Колькі страт прынесьлі праежджым дрэнныя дарогі і разбураныя масты Любаньшчыны, аб гэтым, мы думаем, ведае Любаньскі РВК.

А хто, як не райколгассаюз павінен паклапаціцца аб добрых дарогах для праезду сваіх жа колгасьнікаў. Здавалася-б і на гэта ня трэба рабіць заўвагу. Але „размах“ работы любанцаў прымушае запытаць:—чаму любаньскі райколгассаюз ня дае для дарог рабсілы з колгасаў і саўгасаў: чаму партыйныя і комсамольскія організацыі Любаньшчыны не організавалі мас на ліквідацыю бездарожжа?

Аб суботніку любаньцы і сёньня ня чуюць. Мобілізоўваць масы на рамонт і будаўніцтва дарог любаньцы і сёньня ня думаюць, а прарыў у іх на дарозе паглыбляецца.

За такое становішча адказвае і комсамол. Комсамольскія ячэйкі раёну павінны ў дні суботніка выйсьці штурмаваць бездарожжа, організаваць масы колгасьнікаў і аднаасобнікаў на барацьбу з бездарожжам.

ЦК ЛКСМБ павінен заслухаць справаздачу Любаньскага РК ЛКСМБ аб разгортваньні работы ў галіне выкананьня плянаў дарожнага будаўніцтва па раёне.

П. С-у

Даць варштатам рулявых

По прыкладу менскай комсамоліі, комсамольскія організацыі павінны ўключыцца ва ўсебеларускі конкурс на лепшую школу ФЗВ

З мэтай паляпшэньня працы школ ФЗВ аб'яўлен конкурс на лепшую пастаноўку працы па падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў для ўсіх галін прамысловасьці. Склікаецца ўсебеларуская конфэрэнцыя ФЗВ, якая павінна вызначыць далейшыя шляхі паляпшэньня іх працы.

Аднак зьмешчаны сёньня матар'ял гаворыць аб тым, што на мясцох комсамольскія организацыі не праводзяць падрыхтоўчай працы не ўключыліся ў конкурс на лепшую школу ФЗВ.

Комсамольскія організацыі, па прыкладу Менскай комсамоліі павінны разгарнуць падрыхтоўчую працу да конфэрэнцыі, уключыцца ў конкурс і на аснове абмену вопыту лепшых ФЗВ дабіцца паляпшэньне іх працы.

Скончыць будаўніцтва будвучу

Віцебск. Будвуч рыхтуе вялікую колькасьць сталярных вырабаў для Будаб'яднаньня, Будканторы, Сельбуду і г. д. Сталярныя вырабы Будвучу ідуць на ўдарныя і звышударныя пабудовы БССР. Аднак, праца праходзіць бесплянава. Да гэтага часу няма кантрольных лічбаў і прамфінпляну. З-за недахопу рабочай сілы часта бываюць „бясплянавыя“ прастоі варштатаў і зусім не рацыянальна скарыстоўваюцца вучні 1-га курсу ў якасьці падсобнай рабочай сілы.

Загадчык вытворчасьці ня кіруе майстэрняй, ня сочыць за якасьцю працы і амаль увесь свой час скарыстоўвае ў канторы. Часты выпадкі, калі майстэрня выпускае бракаваную продукцыю. Прыкладна, з комунальнага дому Будвучу зьвярнулі 10 нядобраякасных браковых прасьветаў. У майстэрні пануе абязьлічка. За варштаты і інструманты ніхто не адказвае.

Пабудова Будвучу ідзе марудлымі тэмпамі. Не хапае правадоў, выключацеляў і інш. неабходных матар'ялаў. Будаб'яднаньне не зацікаўлена ў тым, каб хутчэй закончыць будаўніцтва Будвучу.

Д. Усыскін, З. Ваўчок

Перабудаваць сыстэму аплаты

У Будвучы пры БЖС ня прытрымліваюцца агульнага палажэньня аб пераводзе вучняў у вышэйшыя разрады пасьля 6-ці месяцаў працы. У зарплаце—поўная ўраўнілаўка. Лепшыя вучні па вытворчай працы ў цэху і па вучобе ў клясе атрымліваюць уровень з тымі, якія значна адстаюць у вучобе і не спраўляюцца з вытворчай працай у цэху. Другі курс атрымлівае па 3 разраду хаця і ёсьць вучні, якія яшчэ не здалі заданьняў за 1-ы курс па значнай колькасьці дысцыплін.

Ураўнілаўка ня спрыяе зацікаўленасьці вучняў павысіць сваю кваліфікацыю, ня спрыяе зацікаўленасьці ў працы і вучобе. Гэткай сыстэме аплаты, як шкоднай у працы фабзавучу, трэба пакласьці канец. Адміністрацыі і ўсёй грамадзкасьці школы трэба гэты прабел зараз-жа ліквідаваць.

Юнкор.

Палепшыць кіраўніцтва будвучам

Будвуч пры БЖС ад пачатку навучальнага году і да гэтага часу не дабіўся значнага зруху ў палепшаньні якасьці навучаньня. Загадчык Вайнштэйн ня кіруе працай Будвучу. Каменна тынкавальны цэх бязьдзейнічае. Большая частка програмы вучнямі ня ўсвоена.

Процэсы атынкоўкі і праціркі, з якімі вучні павінны былі знаёміцца з пачатку навучальнага году, дагэтуль не выкладаюцца. Тав. Дабравольскі павінен быў кіраваць вытворчаю працай вучняў, але ў сучасны момант працуе на пабочных заработках.

Адміністрацыя Будвучу, замест практычна наладзіць працу па атынкоўцы, корміць вучняў заўтракамі:— На днях, мабыць заўтра, пачнеце вывучаць процэсы атынкоўкі. Гэтыя „заўтра“ мінаюць дзень за днём, а тым часам да працы не прыступалі.

Адпаведным організацыям неабходна прыняць належныя захады палепшыць працу Будвучу, паставіўшы на належную вышыню выкладаньне ўсіх неабходных па спэцыяльнасьці дысцыплін

Р. Падалях.



За лепшую вытворчую практыку

Навучальны год зрываецца

Навучальны год у Магілеўскай школе ФЗУ знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Адпаведныя організацыі праяўляюць у гэтым пытаньні халатнасьць і бязьдзейнасьць. Заняткі з новапрынятымі вучнямі набору 31 году своечасова не пачаліся.

Пры ўзросшай агульнай колькасьці вучняў да 400 чал. інтэрнатам забясьпечаны толькі 65. Застаўся без інтэрнату ўвесь асеньні набор з 120 ч. Да гэтага часу ня высьветлена пытаньне аб пабудове новага інтэрнату. З-за адсутнасьці патрэбнай колькасьці месц у інтэрнаце, на заняткі выкліканы толькі мясцовыя вучні.

Ня лепш справа з памяшканьнямі пад майстэрні. Наяўныя майстэрні зусім не здавальняюць значна ўзросшую патрэбнасьць. Да гэтага часу ФЗВ не ўкомплектаваны належным настаўніцкім складам.

Комсамольская організацыя не прыняла ніякіх захадаў, каб зьнішчыць прарыў у Магілеўскім ФЗВ, ня ўключылася ў абвешчаны конкурс на лепшую школу ФЗВ.

Шалькевіч.

Хлеб чакаць ня можа

Рашаючае значэньне транспорту ў тым, што ён зьяўляецца зьвязваючым зьвяном у агульнай сыстэме нашай соцыялістычнай гаспадаркі. Ад бесьперабойнай работы транспорту залежаць посьпехі нашых перамог.

Што значыць дрэнная праца транспорту? Гэта значыць, калі сэрца нашай краіны—прамысловасьць абасоблена ў ячэйкі, ня зьвязаныя шчыльна між сабою, калі расстроена сувязь між рашаючымі галінамі прамысловасьці, калі заводы і фабрыкі чакаюць сыравіны, калі нячотка наладжана забясьпечаньне рабочай клясы продуктамі харчаваньня, а вёскі продуктамі спажываньня.

Вось чаму пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб транспорце і апошні загад наркома тав. Андрэева аб асеньня-зімовых перавозках асаблівую вагу ўсёй грамадзкасьці зьвяртаюць на транспорт.

Асеньня-зімовыя перавозкі—баявая задача транспорту ў сучасны момант. Кастрычнік—рашаючы месяц. Асеньня-зімовыя перавозкі павінны стаць баявым экзаменам у апошнім квартале, каб вытрымаўшы яго, уступіць у чацьверты—заключны год пяцігодкі.

Таму нашым рапартам наркому павінна быць: „Ёсьць, экзамен будзе вытрыман своечасова ў вызначаны тэрмін. Перабудуем работу транспорту па-новаму. Транспорт падначалім бесьперабойнаму ходу хлебанарыхтовак!“

Штодзённа даць 66 тыс. гружоных вагонаў, давесьці ў чацьвертым квартале процант хворых вагонаў да 17,4, павялічыць работу паравозаў мінімум на 1 гадзіну (давёўшы сутачную работу па 10,7 гадзін), давесьці рух вагона ня менш як да 8 гадзін, замест 6,8 і да 15 лістапада па ўсіх дарогах закончыць аздароўчы рамонт—гэта програма, па якой мы павінны здаваць экзамен.

Гэту програму транспортныя комсамольскія ячэйкі павінны пакласьці ў аснову штодзённай працы ячэйкі, зрабіць яе састаўной часткай барацьбы на вытворчым фронце.

Але гэтага мала. „Комсамол павінен ня толькі сам навучыцца правільна змагацца за выкананьне рашэньняў ЦК УсеКП(б), ён павінен навучыць гэтай барацьбе ўвесь чыгуначны апарат“. (Косараў).

Трэба, каб комсамольскія організацыі сталі ў авангардзе і павялі за сабой усю моладзь на выкананьне вымернікаў асеньня-зімовых перавозак, рушыць транспорт у бой за хлеб.

Бальшавіцкі транспорт павінен быць мобілізаваны на службу хлебанарыхтовак. Не дапусьціць перабояў, дамагацца поўнага зьнішчэньня пробак у пунктах адпраўкі—гэту задачу павінны вырашаць ня толькі транспортныя ячэйкі, але і вясковыя раённыя комсамольскія організацыі.

Мала здаць толькі дзяржаве хлебныя лішкі. Вясковыя комсамольскія ячэйкі павінны сачыць за тым, каб гэты здадзены імі хлеб быў своечасова адпраўлен на месца прызначэньня. Толькі правільная расстаноўка комсамольскіх сіл на гэтым вучастку вырашыць посьпех, зьнішчыць затрымку ў здачы хлеба па віне транспорту.

Тут патрэбна асаблівая ўвага. Пры кожным раёне, с-савеце, пры кожнай вёсцы трэба выставіць комсамольскія пасты, якія павінны штодзённай працай забясьпечваць бязупынны паток здадзенага хлеба, як да пункту адпраўкі, так і пагрузкі на чыгуначным транспорце.

Рашаючую-ж ролю ў гэтым павінны адыграць транспортныя ячэйкі. І тут ня выпусьціць з вока правільную расстаноўку сіл і аказваць практычную дапамогу ў адгрузцы хлеба дзяржаве.

Дабіцца большай адказнасьці клієнтуры за рухомы склад. Не дапушчаць прастою вагонаў і залежкі грузаў. На гэтым вучастку ня зусім добра, аб чым яскрава сьведчаць наступныя лічбы. Толькі па віне клієнтуры за ліпень-жнівень м-цы не пагружаны 3431 вагон. Галоўдартранс, даўшы заказ на 1260 вагонаў скарыстаў толькі 43. Лесбел з 355 вагонаў скарыстаў толькі 272. Комсамольскія організацыі павінны зьвяртаць асаблівую ўвагу на правільны, дакладны падлік неабходных клієнтуры вагонаў.

Далей, неабходна забясьпечыць поўную пагрузку вагонаў. Тут патрэбна забясьпечыць пагрузачныя работы рабочаю сілай скласьці комсамольскія ўдарныя брыгады, каб зьнішчыць прастоі вагонаў, дамагаючыся поўнай

механізацыі пагрузачна-разгружаных работ.

Каб зьнішчыць прастоі вагонаў і забясьпечыць эфэктыўнае скарыстаньне рухомага складу вагоннага і паравознага парку, неабходна дабіцца плянавасьці ў працы рухомага складу. Працу праводзіць па жорсткаму раскладу, які вызначан графікам руху цягнікоў. Паставіць на вышэйшую ступень працу дыспэтчарскага апарату. Устанавіць комсамольскі кантроль за рухам цягнікоў.

Вось конкрэтныя задачы, за выкананьне якіх павінны змагацца транспортныя і вясковыя комсамольскія організацыі ў іх барацьбе за хлеб, за зьнішчэньне пробак на адгрузачных і пагрузачных пунктах.

Комсамольскія організацыі, ўзброеныя прамовай Сталіна, пастановай ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб транспорце і загадам т. Андрэева, павінны драцца за асеньня-зімовыя перавозкі, за хлеб.

Міх. Пашчынскі.

За гаспадарча-разрахунковую сталоўку

ЗМАГАЙСЯ, КОМСАМОЛ!

З моманту апублікаваньня пастановы ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу аб палепшаньні грамадзкага харчаваньня, прайшло даволі часу, каб перабудаваць у корані працу сталовак, каб вызначыць практычныя шляхі перабудовы аддзелаў грамадзкага харчаваньня.

Аднак, зьмешчаны сёньня матар'ял аб становішчы грамадзкага харчаваньня на нова-будоўлях г. Менску служыць довадам таго, што комсамольскія організацыі нова-пабудоў ігноруюць важнейшую пастанову партыі і ўраду.

Гаспадарча-разрахунковая сталоўка з адкормачнымі пунктамі пры ёй—як асноўны вагар перабудовы грамадзкага харчаваньня, ня стала на парадак дня барацьбы комсамольскіх організацый за лепшую, узорную сталовую.

Даць магчымасьць рабочаму паабедаць за 15 хвілін

„Кожны рабочы, кожны член партыі і комсамолец, і ў першую чаргу працаўнікі прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня, павінны забясьпечыць на справе пасьпяховую барацьбу з усімі недахопамі грамадзкага харчаваньня і ператварыць яго ў важнейшую галіну працы па палепшаньню быту рабочае клясы" ЦК УсеКП(б).

Гэта дырэктыва не знайшла практычнага праламленьня ў працы сталоў к будаўнікоў гор. Менску. Праца сталоўкі №19 Белдзяржбуд, Дом ураду пацьвярджае раней вывад аб ігнараваньні пастаноў партыі і ўраду па палепшаньню грамадзкага харчаваньня.

Ні партыйныя ні комсамольскія організацыі пабудоў, як сьлед не займаліся палепшаньнем грамадзкага харчаваньня. У выніку бязьдзейнасьці—стандартыя, дрэннай якасьці абеды, а там... пасьлядоўнае лятунства, незадавальненьне рабочых, што значна адбіваецца на выкананьні будаўнічага фінпляну.

Амаль штодня падаецца капуста, прычым недаваранная і бяз солі, а на другое—каша на цёплай вадзе.

Пры наяўнасьці кепскай якасьці абедаў у сталоўцы пануе антысанітарыя. На сталох бруд, лыжкі іржавыя, на падлове гразь, пабітыя міскі і г. д.

Сталоўкі не прыстасаваны да працы рабочых. Па гадзіне і болей стаяць рабочыя ў чарзе, а бываюць выпадкі што варочваюцца на работу не абедаўшы.

Комсамольская ячэйка Дому ўраду вылучыла комсамольца, які павінен сачыць за чарговай падачай абедаў. Аднак, не падумала аб тым, каб палепшыць якасьць абедаў і пазбыцца іншых шматлікіх недахопаў.

Ня лепш справа і ў новай сталоўцы адкрытай комсамольцамі. Сталоўка не забясьпечвае неабходнай колькасьцю абедаў. Рабочым доўгі час даводзіцца чакаць на двары пакуль паабедае першая зьмена.

Зусім іншы малюнак ў сталоўцы пабудовы Дому друку. Рабочыя абедаюць толькі 15 хвілін. Астатні час абедзенага перапынку скарыстоўваюць на культурны адпачынак: шашкі, шахматы, газэты і г. д.

Па прыкладу сталоўк Дому друку павінны перабудаваць сваю працу ўсе сталоўкі будаўнікоў. Чынную ролю ў перабудове павінны прыняць комсамольскія ячэйкі.

Самакрытыкоўскі.

Зрываюць грамадзкае харчаваньне

БЯЛЫНІЧЫ. Пастанова прэзыдыуму Бялыніцкага РВК аб увядзеньні грамадзкага харчаваньня ў школе ігноруецца опортуністымі з кооперацыі. Мажлівасьці наладжыць грамадзкае харчаваньне не скарыстоўваюцца. Прайшло два месяцы з часу пастановы РВК, а кооперацыя не падумала адчыніць сталоўку.

Такія адносіны кооперацыі зрываюць так неабходную дапамогу бядняцкім вучням Бялыніцкай 7-мі годкі і ШКМ.

Адпаведным організацыям трэба прыцягнуць да адказнасьці опортуністых, якія зрываюць грамадзкае харчаваньне Бялыніцкай сямігодкі і ШКМ і дапамогу бяднейшым вучням.

6 подпісаў.

Сьмецьце і бруд...

Слуцак. Рэалізацыя пастаноў партыі аб грамадзкім харчаваньні не знайшла адбітку ў працы гарбатні № 1 і № 2.

Антысанітарыя зьвіла тут сваё гняздо. У гарбатнях не праводзіцца санмінімум. Шклянкі, талеркі і халаты працаўнікоў пакрыты пластам бруду. Усюды сьмецьце і павуціньне. Такі выгляд гарбатні № 1 і № 2.

Дрэнная пастаноўка працы тлумачыцца тым, што гарбатні ні пераведзены ні на гаспадарчы разрахунак, ня ўжыты бальшавіцкія мэтоды працы: соцспаборніцтва і

ўдарніцтва як паміж працаўнікамі, так і паміж гарбатнямі.

Праві ўнутранага распарадку ў гарбатнях не вядзіцца. На частыя п'янкі і разбой адміністрацыя не зьвяртае ўвагі.

Слуцкі РК КП(б)Б і КСМ і Гарпо павінны ўзяць пад свой кантроль грамадзкае харчаваньне.

Юнкораўскі пост „Ч. З." Ковік Я., Вароўка.

КОМСАМОЛІЯ

Наркомзему, Наркомпрацы, ВСНГБ, Прамкоопэрацыі, Белкоопсаюзу і Колгасцэнтру!

Ты ў адказе за плянаваньне чацьвертага, заключнага году пяцігодкі

Комсамольскія організацыі савецкіх установ павінны забясьпечыць складаньне плянаў 4-га году

Учора на старонках „Чырвонай Зьмены" мы зьмясьцілі адкрыты ліст комсамольскай ячэйкі Дзяржпляну да комсамольскіх ячэек наркоматаў і ведамстваў.

Ліст біў трывогу.

У складаньні пляну чацьвертага заключнага году пяцігодкі—прарыў. Вызначаныя тэрміны праходзяць. Наркоматы і ведамствы не дасылаюць матар'ялаў. Ствараецца небясьпека зьніжэньня якасьці плянаваньня. Комсамолія павінна аўладаць тэхнікай плянаваньня. Але дзяржплянаўцы ведаюць, што трэба біць трывогу. Яны склікалі ся ў выбарчы паход, расставілі комсамольскія пасты на вузлавых пунктах плянаваньня і заклікаюць усе комсамольскія ячэйкі наркоматаў і ведамстваў узяць шэфства над плянаваньнем, устанавіць пільны комсамольскі кантроль над кожнай галіной працы ў складаньні пляну 1932 году і другой пяцігодкі.

Тэрміны бягуць. Комсамольскія ячэйкі наркоматаў і ведамстваў бязьдзейнічаюць. ВСНГБ не дасылае матар'ялаў у Дзяржплян к вызначанаму тэрміну 15-X г. г. Адказныя работнікі губляюць тэрміны, забываюцца, калі трэба дасылаць матар'ялы. А комсамольская ячэйка ВСНГБ не цікавіцца прапрацоўкай матар'ялаў, не змагаецца за іх якасьць.

Аднак з якасных паказчыкаў па ВСНГБ прапрацоўваецца толькі зьніжэньне сабекошту, цэлы рад іншых якасных мерапрыемстваў па-за ўвагай плянаваньня. Тым больш ВСНГБ ня думае даваць пуцёўку—тлумачальную запіску да кожнага пляну.

Значна горш справа з дасылкай матар'ялу па мясцовай прамысловасьці і зусім адсутнічаюць матар'ялы па прамысловасьці саюзнага значэньня.

Да гэтага сьпісу не бальшавіцк й барацьбы за плян чацьвёртага заключнага году пяцігодкі можна дадаць цэлы рад ведамстваў і наркоматаў.

Вось яны: Наркомснаб, Наркомпрацы, Прамкоопэрацыя, Колгасцэнтр, Белкоопсаюз, Наркомзем і інш.

Не дасылаўшы матар'ялаў у вызначаны тэрмін плянавы сэктар Наркомзему разам з тым ня даў адказу і на выклік сельска-гаспадарчай сэкцыі Дзяржпляну ўключыцца ў соцыялістычнае спаборніцтва па сваячасоваму і лепшаму складаньню пляну.

Наогул трэба зазначыць, што ў складаньні плянаў на 1932 год ня ўзяты бальшавіцкія тэмпы. Мэтод соцспаборніцтва і ўдарніцтва паміж паасобнымі наркоматамі і ведамствамі, як рашаючае зьвяно для забясьпечаньня тэмпаў прапрацоўкі матар'ялу, ня стаў галоўным пунктам плянаваньня.

М. Плашчынскі

> ... Пролетарская літаратура павінна дапамагчы партыі і комсамолу даць маладому пакаленьню напрамак у жыцьці...
> ... Работу з пісьменьнікам палепшым, акружым пролетарскіх пісьменьнікаў яшчэ большым клопатам, будзем ім яшчэ больш дапамагаць у іх росьце... (Косараў)

ВЕЧАР КОМСАМОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

ПРОГРАМА:

1. Пролетарская літаратура і барацьба за комсамольскую тэматыку—дакл. т. Ал. Кучар.

Пасьля дакладу—спрэчкі.

2. Выступленьні пролетарскіх комсамольскіх паэтаў і пісьменьнікаў: М. Чарот, А. Александровіч, Б. Броўка, В. Каваль, С. Ліхадзіеўскі, А. Куляшоў, М. Гарцман, Б. Мікуліч, З. Півавараў, С. Знаёмы і інш.

Вечар адбудзецца 27 кастрычніка, а сёмай гадзіне ўвечары ў Доме Навукі і Тэхнікі (Комсамольская, 25).

На вечар запрашаюцца комсамольскі актыў гораду і члены рабочых літгурткоў.

КОМСАМОЛЕЦ, МАЛАДЫ ЎДАРНІК!

Рыхтуйся да вечару. Яшчэ раз азнаёмся з творамі беларускай мастацкай літаратуры, з яе комсамольскай тэматыкай і прыходзь на вечар з конкрэтнай крытыкай, з конкрэтнай прапановай:

А. Александровіч. „Напор", „Вершы і поэмы". М. Чарот. „Сонечны паход". П. Галавач. „Сполах на загонах", „Вінаваты". П. Броўка „Цэхавыя будні", „Каляндры". М. Лынькоў „Апошні зьверыядавец", „Андрэй лятун". В. Каваль „Ілька", „Жніво". С. Ліхадзіеўскі „Рокаты дальняй прыстані". Б. Мікуліч. „Удар", „Наша сонца" П. Трус „Дзесяты падмурак". Є. Знаёмы „За дамбаю"

Менгарком ЛКСМБ, „Чырвоная Зьмена", ячэйка ЛКСМБ пры Доме пісьменьнікаў

Энтузіязм юнкорыі—на фронт хлебазагатован

Опортуністычным адносінам да распрацоўкі і рэалізацыі рашэньняў рабселькораўскага зьезду пакласьці канец

У адносінах да вясковага нізавога друку ЦК УсеКП(б) адзначыў у сваёй пастанове: „да пачатку ўборачнай кампаніі ў кожным колгасе і саўгасе і МТС павінна быць насьценгазэта".

Але гэтая конкрэтная пастанова паасобнымі організацыямі не праводзіцца ў жыцьцё. У цэлым радзе раёнаў насьценгазэты дагэтуль не перабудаваліся (Капыльскі раён колгас „Сталінец", Добра-Мыслінскі савет, Крупскі раён, Стара-Дарожскі і г. д.)

Зараз, калі праходзіць важнейшая політычная кампанія збожжанарыхтовак, калі організуецца ў падарунак 14 гадавіны Кастрычніка ўсебеларускі чырвоны абоз, насьценгазэты гэтых організацый стаяць у баку.

Трэба пакончыць з такім становішчам. Кожная комсамольская організацыя павінна зараз-жа ўзяцца за конкрэтную перабудову працы насьценгазэт. Новыя штодзённікі павінны асаблівую ўвагу ўдзяліць пытаньню падрыхтоўкі колгасаў, саўгасаў, МТС і аднаасобнага сэктару да ўдзелу ў чырвоным абозе. Растлумачыць шырокім колам працоўных мэты абозу, організаваць сустрэчны плян нарыхтовак і г. д.

Хлебанарыхтоўкі па-за ўвагай насьценгазэты

У Добрамысьлінскім сельсавеце, Лёзьненскага раёну, дрэнна ажыцьцяўляецца пастанова партыі аб умацненьні кіраўніцтва нізавым друкам, аб тым, што у кожным колгасе, саўгасе і МТС павінна быць свая насьценгазэта. Большасьць рэдколегій распалася.

Комсамольскія ячэйкі колгасаў „Полымя", „Сталінскі прызыў" і „Вызваленьне" зусім не выдаюць насьценгазэт. У выніку ва ўборачнай кампаніі, зябліве і хлебазагатоўках маюцца вялікія прарывы.

Пастанова другога ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў як ячэйкамі КСМ, так і колгасамі сельсавету яшчэ не распрацавана.

Комсамольскім організацыям трэбна зараз-жа зьвярнуць ўвагу на прапрацоўку пастаноў зьезду партыі.

Нормэс

Зламаць кулацкі саботаж

Рашэньні ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў і 5 усесаюзнай нарады пры „Праўдзе" яшчэ не распрацаваны крупскім комсамолам. Сьценгазэты выходзяць к урачыстасьцям. За 8 месяцаў выпушчана па адной газэце.

Дрэннае кіраўніцтва рабселькораўскім рухам партыйных організацый раёну прывяло к распаду юнкор-брыгады. Юнкоры не мобілізуюцца для правядзеньня гаспадарча-політычных кампаній, у прыватнасьці—адной з важнейшых кампаній—хлебанарыхтовак. Кулацкі саботаж зрывае сваячасовую здачу хлеба прамысловым цэнтрам.

Званар Я.

Дабіцца пералому

Дараганаўская парт'ячэйка Стара-Дарожскага раёну ня кіруе селькораўскім рухам, ня гледзячы на тое, што аб гэтым было дадзена належнае ўказаньне.

Хлебанарыхтоўчая кампанія праходзіць вельмі слаба. На гэтым вучастку юнкоры ня ўдзельнічаюць.

РК КП(б)Б неабходна забясьпечыць сталае кіраўніцтва юнкоррухам і ўдзел юнкорыі ва ўсіх важнейшых політычна-гаспадарчых кампаніях.

Зінгер

Насьценгазэты не павінны быць толькі сьвяточнымі

У колгасе „Сталінец" (Капыльскі р-н) комсамольская ячэйка да гэтага часу не задумалася над тым, як праводзіць у жыцьцё пастановы партыі і рабселькораўскага зьезду.

Аб гэтым гаворыць той факт, што насьценгазэта ня выходзіць ужо некалькі месяцаў.

Важнейшая політычная кампанія—збожжанарыхтоўкі—праходзіць міма яе. Насьценгазэта не змагла мобілізаваць комсамольцаў і ўсю колгасную масу на выкананьне гаспадарча-політычных кампаній.

Насьценгазэта павінна быць ператорана ў баявы орган колгасьнікаў.

Комсамолец

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ

7-га лістапада адчыняецца 4-ая ўсебеларуская мастацкая выстаўка прысьвечаная 14 гадавіне Кастрычнікавай рэволюцыі.

На выстаўцы будуць прадстаўлены ўсе віды выяўленчага мастацтва: маларства, скульптура, графіка, кіно-тэатральныя макеты, эскізы макетаў, пастановак, вопратак і г. д.

Выстаўка будзе зьмяшчацца ў памяшканьні Дому Працасьветы клюбу навуковых працаўнікоў. Тэатральны аддзел гэтай выстаўкі організуецца ў памяшканьні Беларускага Дзяржаўнага Тэатру.

Ільна-канопляводчым трэстам ў саўгасе імя 10-годзьдзя БССР працягнут дадатковы прыём у школу саўгасвучу па спэцыяльнасьцях: токара, сьлесара, каваля і брыгадзіраў па сельгаспрыладам і машынам. Будуць прымацца выключна работніцы, колгасьніцы, альбо іх дзеці жаночага полу і рабочыя, скончыўшыя чатыры групы, ва ўзросьце ад 15 да 18 год.

Прынятыя вучні забясьпечваюцца інтэрнатам. Прыём заяў да 5-га лістапада. Заявы накіроўваць: Любаньскі раён, саўгас імя 10-годзьдзя БССР, школа Саўгасвучу. Для прыезду: Станцыя Старушкі, Зах. чыг. саўгас.

Заг. Школы Бруяк.

Студэнты 3-га курсу Менскага Гідротэхнікуму павінны зьявіцца на заняткі 1-га лістапада.

Студэнты 2-га курсу павінны зьявіцца 9-га лістапада.

Залічаным на 1-шы курс зьяўляцца непатрэбна да асабовага выкліку.

Дырэктар Гідротэхнікуму Мацьвеенка.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.
Друкарня імя тав. Сталіна. Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.